**УДК 39**

# МАСЛЕНІЧНАЯ ТРАДЫЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

***А. С. ЦЫГАНКОВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Адным з найбольш разнастайных цыклаў народнага календара беларусаў з'яўляецца веснавая абраднасць. Неад'емны кампанент веснавога цыкла з'яўляецца Масленіца. У артыкуле аналізуецца час правядзення абраду, варыятыўнасць назваў свята, арэал распаўсюджання, а таксама спецыфіка масленічнай абраднасці на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Крыніцамі даследвання сталі фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы, зафіксаваныя ў рэгіёне ў XIX – пач. XXI ст.*

***Ключавыя словы**: Веснавы цыкл, Масленіца, "Дзяды", калодкі, пахавальныя гульні.*

Веснавы цыкл абрадаў у земляробчым календары пачынаўся яшчэ да наступлення вясны, калі прыходзіла пара рыхтавацца да палявых работ. Абрады, тэксты песень, рытуальныя дзеянні, якія праводзіліся ў памежкавы перыяд былі скіраваны на праводзіны зімы (холаду, цемры, неспакою) і сустрэчу вясны (святла, цеплыні, абуджэння прыроды). У еўрапейскіх народаў у адпаведнасці з хрысціянскім календаром праводзіны зімы сталі спраўляцца перад пастом – у перыяд масленічнага тыдня. Як адзначае В.К. Сакалова, калі ў рускіх свята праводзілася з неверагодным размахам, то ў украінцаў і беларусаў Масленіца не атрымала асаблівага развіцця [10, с. 11]. Даследчык П. А. Бяссонаў нават сцвярджаў, што ў беларусаў на масленіцу звычаяў і абрадаў захавалася менш, чым ва ўкраінцаў [3, с. 135]. Але нягледзячы на тое, што рускі масленічны комплекс з'яўляецца найбольш развітым, у кожнага народа ў ходзе гістарычнага развіцця выпрацаваліся свае адметныя рысы.

Разглядаючы бытаванне абраду на тэрыторыі Беларусі, даследчыкі прыходзяць да высноў, што арэал распаўсюджання свята ахоплівае ўсходнюю Беларусь, а таксама цэнтральную частку краіны. У сваю чаргу на тэрыторыі Падзвіння арэал бытавання абраду абмежаваны, найбольш поўна ён прадстаўлены ва ўсходняй частцы Падзвіння [4, с. 220].

Масленіца (Масленка, Сырніца) – архаічнае свята ў гонар абуджэння прыроды. Час святкавання вагаецца ад 3 лютага да 14 сакавіка. Масленічны перыяд з'яўляецца прамежкавым часам паміж зімой і вясной, што прыводзіць да спалучэння зімовых і веснавых абрадаў.

У некаторых раёнах напярэдадні Масленіцы ў суботу зафіксавана традыцыя спраўляць "Дзяды", яны маюць назву ("Мясніцы", "Масленічныя", "Мясаедныя" Дзяды): "*Радзіцелей мы памінаем у Троіцу, у Раданіцу, і на Дзмітру. А яшчэ тая сыботы перад Масленкай, "тоўстая" сыбота, радзіцельская. Матка навaріць куццю, спячэць бліноў, кісель аўсяны, мяса нагатуе […]*" (Гарадоцкі р-н) [5, с. 65]. Гэтая памінальная традыцыя распаўсюджана на Падзвінні (менавіта ва ўсходняй і цэнтральнай частках рэгіена, а таксама на Докшыччыне), Падняпроўі і Усходнім Палессі [2, с. 327]. Святкаванне Дзядоў напярэдадні Масленіцы не мае прынцыповых адрозненняў ад іншых Дзядоў, але спецыфічнай рысай рэгіена з'яўляецца прыгатаванне для памінальнай трапезы бліноў: "*Адзначалі Масляныя Дзяды – гатавалі ўсе масляное*" (Чашніцкі р-н) [2, с. 328].

Святкаванне Масленіцы на Падзвінні мае шэраг асаблівасцей:

1) Моладзі шлюбнага ўзросту, якія не паспелі пабрацца шлюбам да Масленіцы, на знак сімвалічнага пакарання (каб не засядзеліся ў бабылях ці старых дзеўках) вешалі маленькія драўляныя калодкі. Тыя, мусілі адкупіцца пачастункам [7, с. 129]. У стварэнні сямей была зацікаўлена вясковая грамада, бо гэта станоўча ўплывала на жыццяздольнасць вясковага соцыума. Звычай "чапляць калодкі" не мае на Віцебскім Падзвінні дакладна акрэсленых лакальных межаў, а спарадычна сустракаецца на ўсей тэрыторыі рэгіена [6, с. 158].

2) Любімым заняткам моладзі на працягу масленічнага тыдня было катанне з горак: "*Саначкі бярем, апранаемся ў лапці, а штаноў жа няма, так без штаноў, рубаха такая доўгая, шубу якую падпаяшам вяреўкай – і на гару! Катаемся, адзежа ўся ета абмерзнець і нічога не баліць […]*" (Лёзненскі р-н) [5, с. 71]. Катанне з горак адлюстравана ў масленічных песнях: "*Мы на горку выхадзілі, / Выхадзілі люлі, люлі. / Гору сырам ныбівалі, / Ныбівалі, люлі, люлі. / Маслам гору пылівалі, / Пылівалі, люлі, люлі. / Нашы сані з тырмызамі, / З тырмызамі, люлі, люлі. / Сані з горкі пубіжалі, / Пубіжалі, люлі, люлі. / Нам ахота прыкаціцца, / Прыкаціцца, люлі, люлі*" (Віцебскі р-н) [5, с. 75].

3) Гушканне на арэлях мела магічны характар аграрнай скіраванасці. Лічылася, што чым вышэй уздымаюцца арэлі, тым вышэй вырасце лён. Гэта дзея суправаджалася спевамі песень: "*На вуліцы масленіца, мсленіца, у-у-у-у*[10]*, / Вылецела з куста ластавіца, ластавіца, / Села яна на тыну, на тыну, /*

[10]Паўтараецца пасля кожнага радка.

*Акідала масла па каму, па каму […]”* [8]. Для песень, якія маюць загукальную скіраванасць, характэрныя імітацыі галасоў птушак.

4) Адметнай рысай паўночна-ўсходняй тэрыторыі Падзвіння з’яўляюцца архаічныя масленічныя гульні, прымеркаваныя да сустрэчы і провадаў Масленіцы. Пахаванне “дзеда” (“Дзед касцей падавіўся”) і “бабы” (“Баба сырніцай падавілася”) зафіксаваны ў Гарадоцкім, Шумілінскім, Лезненскім, усходняй частцы Полацкага раенаў [5, с. 158]. Аналіз структуры і зместу абраду дазваляе сцвярджаць пра існаванне лакальнай варыятыўнасці згаданых абрадаў. Напрыклад, у якасці “дзеда” і “бабы” у розных весках маглі выкарыстоўваць то жывога чалавека (Шумілінскі раен), то лялька (Гарадоцкі, Лезненскі, усходняя частка Полацкага раенаў), якую (в. Маскаляняты Гарадоцкага раёна) закапвалі ў снег [5, с. 689]. А ў в. Канавалава гэтага ж раёна пудзіла пакідалі ў сараі. На думку некаторых даследчыкаў, расправа над “дзедам”, “бабай” мела язычніцкае паходжанне і сімвалізавала перамогу лета над зімой. Іншыя навукоўцы лічаць, што смерць з’яўляецца неабходнай умовай для адраджэнне прыроды вясной [6, с. 161].

Да масленічнага тыдня прымеркавана шмат павер’яў і прыкмет, некаторыя з іх звязаны з жаданнем прадбачыць будучы лес: “*После ўжіна, на масляныя “запысты” не выходзя із-за стала, семьяне бросають своі ложкі под стол, чья ложка ўпадет перевернутою і головой к “куту”, тот не дождется тех-же “запыстов” будущего года*” [9, с. 239]. Запусты – гэта апошні дзень масленічнага тыдня. Згодна з меркаваннем Т.І. Кухаронак само свята Масленіца можа называцца Запустамі. “Мясныя запусты” ўвасабляюцца ў вобразе Дзеда, кажуць: “Дзед падавіўся косткай”. Гэты матыў неаднаразова будзе гучаць падчас гульні. “*А дзедка мой, Сідорка, чаго ж ты памер, чаго ж ты рана ад нас улятасш? Якая ж табе прычыначка, на каго ж ты нас пакідаеш?”– “Косткай падавіўся, еў мяса, ды падавіўся... Зубоў не было, вот і падавіўся косцей*” [6, с. 159].

У асноўным усе прыкметы і павер’і ў часе святкавання Масленіцы маюць аграрную скіраванасць і маюць мэтай паляпшэнне ўрадлівасці і плоднасці зямлі*: “Как мужчіны так і женщіны должны […] “полоскать зубы” вне дома в карчме. […] Раді лучшего ўрожая женщіны делают это на будущем яровом поле”* [9, с. 240]; *“Прежде чем возіцца ў Масленіцу на санках “женкі” должны проехать с горы на пряліце: чым дліне будеть такое проезд, тем длінейшій уродітся лен”* [9, с. 240]. Паводле М. Я. Нікіфароўскага ў перыяд Масленічнага тыдня нельга *“прясть, сучіть ніток і віть веревкі, чтобы ні накрціць червей на капусту і сады”* [9, с. 240].

Сімвалам Масленіцы лічыцца бліны, але як адзначае В.К.Сакалова, знакам масленіцы бліны сталі толькі ў рускіх, для ўкраінцаў і беларусаў яны не характарныя [10, с. 47-48]. Распаўсюджанне выкарыстання бліноў не толькі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, але і паўсюдна па Беларусі, верагодна з’яўляецца вынікам рускага ўплыву на памежныя тэрыторыі. Фалькларыст XIX ст. П.А. Бяссонаў адзначае, што галоўнай беларускай масленічнай стравай былі не бліны, а варэнікі з сырам: «Кое-где, ближе к нам [рускім], [распаўсюджаны] блины и аладьи, но общее вареник с начинкой и особенно сыром: сыр […], овечий и козий» [3, с. 135]. Зараз жа бліны – гэта адзін з самых вядомых і распаўсюджаных сімвалаў Масленіцы, але, як паказвае даследванне, падставай для гэтага ў асноўным быў уплыў іншай традыцыі.

Яшчэ адным сімвалам Масленіцы, з’яўляецца спальванне пудзіла, якое штучна атрымала распаўсюджанне на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Але даследчыкі адзначаюць, што ў беларусаў абраду спальванне пудзіла і распальвання на масленіцу вогнішчаў не было [10, с. 35]. Гэты тэзіс пацвярджае як аналіз апублікаваных матэрыялаў [5], так і архіўных.

Такім чынам, масленічны абрад – архаічнае свята, якое сімвалізуе сустрэчу зімы з вясной. Арэал распаўсюджання Масленічнага абраду ахоплівае ўсходнюю Беларусь, а таксама цэнтральную частку краіны. У сваю чаргу, на тэрыторыі Падзвіння арэал бытавання абраду абмежаваны. Найбольш поўна масленічны абрад прадстаўлены ва ўсходняй частцы Падзвіння. Звычай памінаць продкаў на Масленіцу сустракаецца ва ўсходняй і цэнтральнай частках Падзвіння, у Падняпроўі і Ўсходнім Палессі, таксама перыядычна сустракаецца і на Міншчыне, але на Брэсцкім Палессі і Панямонні Масленічныя Дзяды амаль не фіксуюцца. На Масленіцу, як і на іншыя каляндарныя святы, забаранялася працаваць. З надыходам XX стагоддзя, сімвалы і вобразы Масленіцы пачынаюць разбурацца, а само свята пераўтвараецца ў свецкае гулянне. Гэта звязана з працэсамі ўрбанізацыі і мадэрнізацыі вёскі, якія прывялі да разбурэння традыцыйнага светапогляду. На сенняшні дзень мы назіраем тэндэнцыю ўніфікацыі культуры, калі не гледзячы на рэгіянальныя асаблівасці, напрыклад, для Падзвіння – гэта гушканне на арэлях, вешанне калодак і пахавальныя гульні, Масленіцу сустракаюць тыпова амаль па ўсей Беларусі, з спаленнем пудзілы і прыдуманымі конкурсамі. З-за працэсаў урбанізацыі і мадэрнізацыі вёскі, такое свята як Масленіца трапіла пад моцны ўплыў гарадской культуры і моцна змянілася. Але нават яшчэ ў наш час ў ходзе фальклорна-этнаграфічных экспедыцый фіксуюцца ўспаміны аб традыцыйным характары спраўлення свята.

ЛІТАРАТУРА

1. Аўсейчык, У. Я. Да пытання аб этнакультурным раянаванні Беларускага Падзвіння / У. Я. Аўсейчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс]: электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – С. 214-228.
2. Аўсейчык, У.Я. Традыцыі памінання продкаў у структуры масленічнай і вербнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У.Я. Аўсейчык // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : мат. Міжнароднайнавук.-практ. канф. (20–21 лістапада 2014 г., г. Мінск) / уклад. Ю. В. Пацюпа; гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтрдаследаванняўбеларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – с. 327-330.
3. Бессонов П. А. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта/ П. А. Бессонов.- Москва, 1871. –
4. Боганева, А. М. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе/ А. М. Боганева, Т. В. Валодзіна, М. А. Козенка, В. А. Лабачэўская, І. Ю. Смірнова. – Мінск, 2013. – 1231 с.
5. Варфаламеева, Т.Б. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларускаянавука, 2004. – 910 с.
6. Кухаронак, Т.І. “Дзед касцей падавіўся”: рэгіянальна-лакальная спецыфіка масленічнай гульні беларусаў Падзвіння/ Т.І. Кухаронак // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых прац міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова (Полацк, 21 – 23 красавіка 2011 г.) : у 2 частках . / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; [пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача.]. - Наваполацк : ПДУ, 2011. - Ч.2. - С. 158-161.
7. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі: вучеб.-метод. комплекс / У.А. Лобач. – Наваполацк, 2006 г.: ПГУ – 195 с.
8. Мажэйка, З.Я. Голоса веков [Электронный ресурс] // З.Я. Мажэйка, А.І. Шкляроўскі – Мінск: Беларусьфильм, 1979 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ethnoby/videateka/526395026. Дата доступу: 05.05.2020.
9. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи… Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровкий. – Витебск: Губерн. Тип-литограф., 1897. – 338 с.
10. Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов XIX – начало XX в./ В. К. Соколова. – Москва: «Наука», 1979 г. – 287 с.